Ф.Д.Клімчук, Я.Р.Самуйлік

## ГІДРОНІМЫ ВЫГАНАЎСКАГА ПАЛЕССЯ (МОЎНА-ЭТНІЧНАЯ ІНТЭРПРЭТАЦЫЯ)

Выганаўскае Палессе знаходзіцца ў міжрэччы Шчары (прыток Нёмана) і Ясельды (прыток Прыпяці). Тут самая кароткая адлегласць паміж рачнымі сістэмамі Нёмана і верхняй Прыпяці. Дзякуючы гэтаму з найстаражытнейшых часоў яно з"яўлялася адным з асноўных "калідораў", праз які адбываліся сувязі паміж насельніцтвам Панямоння і Заходняга Палесся.

У Выганаўскім Палессі перавафкаюць славянскія гідранімічныя назвы. Сярод іх выдзяляюцца дзве групы. Першая — назвы этымалагічна празрыстыя: рэкі і рэчкі Бобрык, Рудня, Рудая, Рэчыца, Гнілы, азёры Выганаўскае, Бабровіцкае, Пагостскае. Другая група — архаічныя славянскія назвы. Іх узнікненне, відаць, адносіцца да праславянскага і ранняўсходнеславянскага перыяду. Гэта назвы:

Балотны масіў Стубла. А.М.Трубачоў гідронімы з асновай stubl / stublo адносіць да старых славянскіх.

Рака Дарагабужа — прыток Ясельды. У.М.Тапароў і А.М.Трубачоў дапускаюць, што гэта назва з"яўляецца старым вытворным на -ja- ад славянскай формы *Дорогобудь < *Dorgobud .

На думку Р.А.Агеевай (вуснае паведамленне), — гэта тыповы славянскі кампазітыўны тып.

Рака Лютня — прыток Лані. Па У.М.Тапарову і А.М.Трубачову, назва паходзіць ад славянскага кораня *lot 'лыка'.

Рака Вет — прыток Бобрыка. У.М.Тапароў і А.М.Трубачоў аддаюць перавагу славянскай этымалогіі назвы. В.А.Жучкевіч дапускае вытокі назвы ад кораня -вет-, прыводзячы ў якасці ілюстрацыі рус. ветка, белар. паветка.

Рака Чамля — прыток Бобрыка. Этымалогія кораня гэтай назвы цёмная. Суфікс жа -ля — архаічны славянскі (У.М.Тапароў, А.М.Трубачоў). Гэта дае падставы лічыць, што ўтварэнне назвы адносіцца да праславянскай эпохі.

Рака Косава — прыток Грыўды. Гідронім, відавочна, узнік ад назвы горада Косава. Параўн. старадаўнія гарады з такой жа назвай: Косаў у Івана-Франкоўскай вобласці УССР, Косава у Югаславіі.

Сустракаюцца на Выганаўскім Палессі і балтыйскія назвы. Да іх, відаць, можна аднесці наступныя:

Рака Нача — прыток Лані: параўн. лат. nakt 'ісці' (У.М.Тапароў, А.М.Трубачоў).

Рака Цна — прыток Прыпяці: параўн. ст.-пруск. tusnan 'ціхі' (У.М.Тапароў, А.М.Трубачоў). Менш верагодная славянская этымалогія назвы.

Рака Лань (варыянты Лана, Лунія) — прыток Прыпяці. Назва верагодна ўзнікла на балтыйскай дыялектнай аснове: наяўнасць гідронімаў з коранем Lun на сучаснай балтыйскай тэрыторыі, літ. liunas 'балота' (У.М.Тапароў, А.М.Трубачоў). Параўн. таксама літ. lanka лат. lanka 'балота, даліна, луг, лес на балоце' (Л.Г.Неўская).

Рака Мышанка — прыток Шчары. Відаць, літ. miskas 'лес' + славянскі суфікс -анк-. Параўн. назву прытока Заходняга Буга — р.Лясная. Славянская этымалогія назвы менш верагодная.

Рака Грыўда — прыток Шчары — хутчэй за ўсё яцвяжскі гідронім (К.Буга).

Назва ракі Шчара адносіцца да цёмных. Можна, аднак, дапусціць балтыйскую этымалогію: параўн. гідронім Stervas у Літоўскай ССР, які А.Ваганас узводзіць да straubas 'паток, цячэнне'.

Гідронім Ясельда хутчэй за ўсё з"яўляецца "гібрыднай"

славяна-яцвяжскай назвай: тут славянскі корань $^{*}$jasl і яцвяжскі фармант da (Ф.Д.Клімчук). Гл. вышэй гідронім Мышанка. Назва Ясельда, відаць, узнікла ў вярхоўях гэтай ракі. Тут у шэрагу месц выяўлены так званыя "парныя" курганы — славянскія помнікі УШ—Х стст. (І.В.Біруля), а сярод курганаў Х—ХШ стст., акрамя славянскіх, сустракаюцца яцвяжскія (В.В.Сядоў).

У Выганаўскім Палессі і яго наваколлях нямала гідронімаў, этымалогія якіх, цёмная, непразрыстая. Гэта назвы рэк Вісла, Высліца, Бусяж, Вызжары, Гоцішча, Жыгулянка (Жыжгулянка, Жэжгулянка), Муразічна, Чаеўка, Чэперка, возера Вяда і інш. Спынімся на некаторых з іх.

Рака Высліца — прыток Бобрыка, рака Вісла — прыток Высліцы. Верагодная сувязь з польскай Віслай. У даследчыкаў пераважае думка аб славянскім паходжанні (гл. В.А.Никонов. Кратк. топон. словарь. М., 1966). Звычайна назва ўзводзіцца да гіпатэтычных славянскіх асноў з індаеўрапейскіх veis або veid са значэннямі 'плысці, цячы, вадкасць, сырасць' ці 'віць, згінацца'. У заходнееўрапейскіх гаворках існуе слова вісла са значэннямі 'рака, ручай, балота, вясеннія разлівы'. Выказваліся меркаванні аб кельцкім (ірл. usse 'вада'), балтыйскім (ад асноў $^{*}$vis-/veis-), , германскім паходжанні назвы.

Рака Вызжары — прыток Жыгулянкі: параўн. белар. дыял. вы-жар 'выпаленае месца'.

Возера Вяда: магчыма ад кораня $^{*}$ved славянскага ці балтыйскага (Р.А.Агеева, вуснае паведамленне) .

Рака Муразічна — прыток Вета: параўн. гідронім Мурзя на Украінскім Палессі.

Рака Бусяж — прыток Грыўды. В.А.Жучкевіч прапануе паходжанне назвы ад буса 'выдаўбанае судно ці лодка' (руск. дыял.). Параўн. таксама бус 'дробны дождж, туман' (Э.М.Мурзаеў), руск. бусый 'шэры'. Аб гідронімах з элементам -ж на канцы А.М.Трубачоў гаворыць, што "некаторым з іх цяжка адмовіць у старажытнасці, і пры гэтым яны ствараюць уражанне славянскіх назваў".

Рака Жыгулянка — прыток Дарагабужы. Параўн. белар. дыял. жыгала 'металічны прут для прапякання дзірак', ст.-руск. жигало, жегало 'кадильница'; відаць, праславянскае ўтварэнне ад $^{*}$žigati, $^{*}$zegati, зыходнае значэнне якога 'апальваць,

апякаць' (ЭСБМ, т.3). З другога боку, — літ. zigis 'луганы ручай', гідронімы з кампанентамі zag-, zaug-, ziog-у Літоўскай ССР.

Як бачым, у разгледжаных назвах з непразрыстай этымалогіяй праглядаецца індаеўрапейскі характар асновы. Непразрыстасць за геаграфічнай назвы часцей за ўсё сведчыць аб старажытнасці яе ўтварэння. Наяўнасць у даследуемым рэгіёне значнай колькасці гідронімаў з непразрыстай, цёмнай асновай, а таксама архаічных сведчыць аб адсутнасці перарыву ў яго засяленні са старажытных часоў.

Такім чынам, па этналінгвістычнай (моўна-этнічнай) інтэрпрэтацыі выдзяляюцца наступныя групы гідронімаў: 1) магчыма, праіндаеўрапейскія; 2) архаічныя славянскія. Наяўнасць іх сведчыць аб тым, што ў даследуемым рэгіёне славяне жылі яшчэ ў праславянскую эпоху; 3) познія славянскія; 4) балтыйскія. Пашыраны яны на поўначы і на ўсходзе рэгіёна. Наяўнасць ва ўсходняй частцы Выганаўскага Палесся як старажытных балтыйскіх, так і архаічных славянскіх гідронімаў сведчыць аб старадаўніх славяна-балцкіх кантактах, 5) "гібрыдныя" гідронімы.